# Падарожнікаўцягне ў балота.

Да прывабных турыстычных зон можна аднесці заказнікі "Спораўскі" ў Брэсцкай вобласці, "Ельня" ў Віцебскай, Ліпічанскую пушчу— у Гродзенскай, — лічыць начальнік упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыроцных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Наталля Мінчанка. — Замежнікаў там з кожным годам становіцца ўсё больш: не толькі турыстаў, але і спецыялістаў па водна-балотных рэсурсах.

Напрыклад, арнітолагаў, якія, узброіўшыся дарагім абсталяваннем, назіраюць эа птушкамі. Асаблівай папулярнасцю карыстаецца Рэспубліканскібіялагічнызаказнік"Спораўскі" — адзін з найбуйнейшых у Еўропе. Тут ёсць унікальнае нізіннае балота, прыйшоўшы на якое можна наглядна вывучаць Чырвоную кнігу. Дзе яшчэ ўбачыш адразу і кулікоў, і вяртлявых чарацякак, і белыя гарлачыкі, і разакі!

— Усяго летась нас наведалі каля 700 чалавек, сярод іх — 37 замежнікаў: чэхаў, немцаў, палякаў, — прыводзіць статыстыку дырэктар заказніка Уладзімір Пратасевіч.

Малавата. Зрэшты, "Спораўскі" — гэта толькі адзін з пунктаў магчымага воднага маршруту. Калі ўзяць вёслы і праплысці па рацэ Ясельда сотню кіламетраў на ўсход, можна дабрацца да "палескай Венецыі" — аўтэнтычнай вёсачкі Кудрычы, размешчанай на 7астравах сярод балот. Аднак даязджаюць сюды толькі рэдкія госці. Мясцовыя начальнікі чамусьці саромеюцца драўляных хат з чарацянымі стрэхамі.

А вось аматары актыўнага адпачынкумаглібадправіццанапоўнач Беларусі. Да прыкладу, у Расонскім раёне, які славіцца каскадам са 192 азёр, пару гадоў назад быў распрацаваны водны маршрут. Яго даўжыня — каля 240 кіламетраў. Ён аб'ядноўвае дзесятак азёр і дзве ракі. Але праходзіць на лодках і байдарках усю дарогу зусім не абавязкова. Пакуль маршрутам зацікавіліся толькі некалькі груп. Мясцовыя ўлады спасылаюцца на недахоп інфраструктуры і слабую рэкламу. Зрэшты, ужо сёлета збіраюцца правесці "работу над памылкамі" і зацікавіць нетолькі патэнцыяльных турыстаў, але і інвестараў.

— Усяго нашы азеры летась наведалі каля 2000 чалавек, — удакладняе начальнік аддзела спорту і турызму Расонскага райвыканкама Аксана Патапава. — Але гэта афіцыйныя лічбы. Яшчэ шмат адпачывальнікаў прыязджаюць "дзікунамі". Іх мы не ўлічваем.

Безумоўна, экалагічны напрамак цалкам можа стаць той нішай, якую зойме краіна на рынку еўрапейскіх турыстычных паслуг. Галоўнае, не перастарацца. Бо, спрабуючы развіць інфраструктуру, можна загубіць прыроду і аўтэнтычнасць.

***Дзмітрый Ампілаў***



**Источник:** Беларусь.-2010.-№ 3.-С. 31.